**Список использованных источников**

1. *Каладзінскі, М. А.* Тэатр лялек Савецкай Беларусі / М. А. Каладзінскі ; пад рэд. А. В. Сабалеўскага. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – 243 с.

2. *Калашникова, А. В.* Театр кукол как объект арт-менеджмента / А. В. Калашникова // Арт-менеджмент как вид управленческой деятельности : сб. ст. / под ред. С. Б. Мойсейчук, А. И. Степанцова. – Минск : Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, 2011. – С. 86–95.

3. Нацыянальная тэатральная прэмія. Што далей? [Электронный ресурс] / Афіцыйны сайт штотыднёвай грамадска-асветніцкай газеты «Культура». – Минск, 2014. – Режим доступа: http://kimpress.by/index.phtml?page=2&DomainName=mast&id=1100. – Дата доступа: 07.02.2014.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*У. А. Жылко, аспірант БДУКМ*
*Навуковы кіраўнік – А. І. Смолік,*
*доктар культуралогіі, прафесар*

# ДАМІНУЮЧЫЯ ІДЭАЛЫ РЭАЛІСТЫЧНАЙ ПАРАДЫГМЫ САЦЫЯКУЛЬТУРНАГА РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА XIX ст.

Чалавечая прырода прадугледжвае імкненне да ідэалу, якое знаходзіць сваё адлюстраванне ў культуры той ці іншай эпохі. Існаванне супольнасці немагчыма без грамадскіх ідэалаў, паколькі менавіта яны абуджаюць у грамадскай супольнасці агульныя пачуцці гонару, веру ў свае сілы. Агульная характарыстыка ідэалу ў філасофскай літаратуры палягае ў тым, што пад дадзенай катэгорыяй разумеюць духоўнае адлюстраванне пэўнага ўзору, пажаданага вобраза, які адрозніваецца ад паўсядзённай рэчаіснасці і валодае пабуджальнай сілай да дзеяння.

Найбольш глыбокае ўсведамленне грамадскага ідэалу ў беларускай сітуацыі адбываецца праз мастацтва як сродак аб'ектывацыі ідэальных канструкцый. Неабходна падкрэсліць, што ў другой палове XIX ст. ва ўмовах імперскага кантролю за любымі праявамі грамадскай думкі нацыянальная рэфлексіўная філасофія культуры не магла развівацца ў форме тэарэтычнага мыслення – яна выражалася ў форме літаратурных мастацкіх алюзій. Менавіта праз дадзеныя алюзіі падаецца магчымым выявіць дамінуючыя грамадскія ідэалы таго часу. Найбольш паслядоўна рэалістычная парадыгма раскрываецца ў творчасці Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, В. Каратынскага, К. Каліноўскага.

Ідэалы канкрэтна гістарычныя і культурна абумоўлены. У межах рэалістычнай парадыгмы каштоўнаснае пераасэнсаванне атрымлівае найперш асоба простага селяніна як носьбіта высокіх маральных якасцяў, паколькі XIX ст. – перыяд павышанай актыўнасці імперскіх ліквідатараў у Беларусі і фактычна ў процівагу ім адбываецца станаўленне і адкрыццё народа як самастойнага супольнага суб'екта культуры і анталагічнай значнасці народнай культуры.

У прадстаўніку народа суб'екты рэалістычнай парадыгмы бачылі носьбіта сумарнага вопыту ўсёй грамады, які, нягледзячы на звыродлівасць акупанцкіх і класавых умоў існавання, здолеў захаваць у сабе спрадвечную мудрасць, асабістую годнасць і волю да жыцця. У творчасці У. Сыракомлі відавочнай з'яўляецца ідэалізацыя «братоў у сярмязе і світцы», з якімі пісьменнік адчувае ледзь не кроўную, братэрскую паяднанасць і сваяцтва па Радзіме. Фактычна адкрыў для сябе беларускі народ як адну з дамінуючых каштоўнасцей у грамадстве Я. Лучына: «Што мне натоўп з кішэняй набітай? / Схіляць галаву не буду. / Я перавагу аддам адкрыта / Беднаму простаму люду» [3, с. 85].

Беларускі ідэал у рэалістычнай парадыгме не выносіцца за межы чалавечага свету, а вырастае з рэальнага жыцця [5, с. 49]. У межах светапогляднага складніка рэалістычнай парадыгмы можна вылучыць імкненне да ўзнаўлення жыццёвай праўды, якая паказвае пэўную неадпаведнасць тагачаснага грамадскага ладу нормам чалавечнасці, гуманістычнай маралі. Так аўтарскія рэфлексіі В. Каратынскага знайшлі сваё ўвасабленне ў адлюстраванні трагедыі селяніна Тамілы, які сумленна працуе, спраўна моліцца Богу, спачувае бліжняму, мае распрацаваную душу, адчувае выразную з'яднанасць з навакольным светам і прыродай як яго часткай і адначасова змушаны трываць нястачу і цярпліва зносіць пакуты ды здзекі. Пісьменнік праз крытычнае адлюстраванне ўмоў існавання і відавочны дысананс іх з ідэалізаваным вобразам селяніна выразна скіроўвае на неабходнасць змянення грамадскага ладу на аснове ідэалаў свабоды, праўды і справядлівасці.

Народу як суб'екту культуры, такім чынам, характэрна неверагодная воля да жыцця: выжыць пры любых абставінах, нават самых жорсткіх, захаваўшы пры гэтым сваю годнасць. «Ды хоць няма хлеба, жабраваць ня буду, / Пражыву як-кольвек ад працы, ад труду!» [1, с. 33]. І ў гэтым ужо бачыцца своеасаблівае

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

негвалтоўнае змаганне з існуючай сістэмай за ідэал свабоды ва ўмовах яе абмежавання для прадстаўніка народа: праз пераадоленне і вытрымку нягодаў, цяжкую, але сумленную працу, трагізм свайго бяспраўнага становішча селянін выгартоўвае душу і мацуецца ў гераічнасці праз свае пакуты, захоўваючы спрадвечную мараль (людскасць) і ўласную годнасць, арыентуючыся на боскія ідэалы дапамогі бліжняму і распрацоўваючы душу ў сузіранні прыроднай вітальнасці і характва.

Ф. Багушэвіч праз адлюстраванне крайняга ўзроўню сацыяльнай несправядлівасці («Кепска будзе!», «Бог не роўна дзеле») не толькі крытыкаваў сацыякультурную сітуацыю таго часу, ён меў на мэце матываваць селяніна да дзеяння, тым самым пераўтварыць энергію пакут ў энергію актыўнага супраціву ў імкненні да свабоды як да абароны свайго.

Умовы абмежаванасці ці ўвогуле адсутнасці магчымасці сацыяльнага дзеяння з'яўляліся першым чыннікам фарміравання ў індывідуальнай і супольнай суб'ектыўнай свядомасці ідэала свабоды. Яе адлюстраванне ў канкрэтных каштоўнасцях залежыць ад маралі і ўзроўню культуры грамадства. Гэта ёсць катэгорыя аб'ектыўная. Рэлятывісцкі падыход тут памылковы і прыводзіць да знішчэння свабоды. У філасофскім сэнсе свабода – гэта магчымасць вечнага развіцця да ідэалу [4, с. 13]. Рэалісты сцвярджалі, што шчасце чалавека магчыма толькі тады, калі будзе свабодным увесь народ. У іх інтэрпрэтацыі сацыяльна-палітычны ідэал свабоды выказвае супольную тэндэнцыю змагання за вызваленне не толькі селяніна з-пад прыгону, але і краіны з-пад акупацыі імперыі: у беларускім сэнсе свабода – ёсць імкненне бараніць сваё.

Ідэл эканамічнай, палітычнай, сацыяльнай і асабістай свабоды або вольнасці ў творчасці К. Каліноўскага атрымаў наступную інтэрпрэтацыю: «Мы сягодня ўсе ўжэ ведаем, што чалавек вольны, гэта калі мае кусок сваей зямл… – калі не ідзе ў рэкруты чорт ведае гдзе, а ідзе бараніці свайго краю тагды толька, калі які непрыяцель надыдзе, – калі робіць усенька, што спадабае і што не крыўдзіць бліжняга і хвалы боскай, – і калі вызнае тую веру, якую вызнавалі яго бацькі, дзяды, прадзеды. От што вольнасць значыць» [2, с. 25].

Культуралагічны дыскурс мастацка-публіцыстычнай спадчыны К. Каліноўскага дэманструе гарманічнае спалучэнне абстрактных тэарэтычных уяўленняў аб грамадскім ідэале свабоды і канкрэтных, даступных разуменню простага чалавека яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

змястоўных параметраў, якія носяць каштоўнасны характар і разглядаюцца ў межах народнай аксіялогіі: роўнасць усіх людзей перад Богам, свая зямля як гарант свабоды, свая справядлівая, а не навязаная вера (уніяцтва) і звязаныя з ёй маральныя пастулаты, сацыяльная справядлівасць і патрыятызм, выражаны ў гатоўнасці служэння і абароны Айчыны ў выпадку небяспекі.

У беларускай сацыякультурнай сітуацыі XIX ст. адным з актуальных у межах рэалістычнай парадыгмы быў матыў праўдашукальніцтва. Свет чалавечы здаўна быў недасканалы, таму людзі заўсёды шукалі праўду, ісціну, справядлівасць. У аснове дадзенага матыву палягае катэгорыя праўды. Праўда народнай справядлівасці («мужыцкая праўда») выступае ў якасці ідэацыйнага канцэпта [5, с. 156] і дамінуючага ідэалу ў творчасці К. Каліноўскага. Непасрэдным доказам таго выступае аўтарская рэфлексія наконт першаступеннасці праўды перад іншымі вышэйшымі катэгорыямі, у якасці якіх выступае Бог і шчасце асабістае: «Калі за нашу праўду Бог нас стаў караці / Дай у прадвечнага саду вялеў прападаці, / То мы прападзем марна, но праўды не кінем, / Хутчэй Неба і шчасце, як праўду, абмінем» [2, с. 37]. Такім чынам, відавочным выступае размеркаванне прыярытэтаў: праўда і яе спасціжэнне пераўзыходзяць па значнасці нават гарантаванасць боскага выратавання.

Менавіта праўда стаяла на чале нацыянальнага самаўсведамлення ды выкрышталізоўвання нацыянальнай ідэі, паколькі на аснове праўды не толькі спасцігаецца сапраўдная сутнасць рэчаў і з’яў як у сінхранічным, так і ў дыяхранічным плане, але і ў выніку прадпрымаюцца спробы карэкціроўкі рэальнасці на аснове азначанага ідэалу.

Творчае інтэнцыйнае канструяванне, якое складае аснову ідэалатворчасці ў межах рэалістычнай парадыгмы, найперш праектуе ідэал свабоды на ўзроўні падсвядомасці і карэлюе яго з рэальнасцю сацыяльнага быцця [5, с. 172]. Так, у змаганні за ідэал свабоды К. Каліноўскі, відавочна, апазіцыйна настроены ў адносінах да дэспатыі і да яе канкрэтна-гістарычнай формы – «расейскага самадзяржаўя», стаіць на пазіцыі таго меркавання, што грамадская супольнасць мусіць згуртавацца і дзейнічаць у адпаведнасці з адзінай праграмай, якая б вызначала паводзіны кожнага ў справе дасягнення агульнай мэты: «Бо каб мужыкі ўсе разам былі збунтаваліся і ўхапілі за сакеры, нажы і косы, так бы маскаль мусіў бы прапасці без паўстаня і мы на век вякаў ужэ былі бы вольны» [2, с. 23–24].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ідэал сацыяльнай кансалідацыі, народнага яднання дзеля дасягнення галоўнай мэты – свабоды – у рэфлексіўна-публіцыстычнай творчасці К. Каліноўскага выступае як вектар, задаючы накіраванасць неабходных сацыяльных зменаў. «Но не доўга яны нас будуць абдзіраці, бо мы пазналі, гдзе сіла і праўда, і будзем ведаць, як рабіць трэба, каб дастаць зямлю і свабоду. Вазьмемся, дзецюкі, за рукі і дзяржэмся разам!» [2, с. 22]. «За мужыцкую крыўду стойце смела, усе разам… Падумайце добра, да, памаліўшыся Богу, станьма дружна разам за нашую вольнасць!» [2, с. 32]. Так К. Каліноўскі шляхам супастаўлення несправядлівасці тагачасных сацыяльных адносін выявіў значную інтэнцыю актыўнага сацыяльнага дзеяння.

Як слушна зазначыў Г. Гегель, толькі праз ажыццяўленне вялікіх мэтаў чалавек выяўляе ў сабе вялікі характар, які робіць яго маяком для іншых. У межах беларускай сітуацыі некаторыя носьбіты рэалістычнага светапогляду дзейнічалі ў адпаведнасці з апісанымі ў мастацкай або публіцыстычнай творчасці праграмамі, тым самым былі не толькі інтэрпрэтатарамі, але і выразнікамі грамадскіх ідэалаў на справе, у вырашэнні жыццёваважных для грамадства задач, што ў будучыні забяспечыла іх статусам культурных герояў. У дадзеным выпадку сутнасць і мэта «гераізацыі» – даць людзям стымул дзейнічаць па прыкладзе герояў. К. Каліноўскі, з’яўляючыся прадстаўніком рэалістычнай сацыякультурнай парадыгмы, у свой час узначальваў нацыянальна-вызвольнае паўстанне, Ф. Багушэвіч актыўна ў ім удзельнічаў – абодва як на слове, так і на справе даказалі сваю актыўнасць на шляху да рэалізацыі ідэала шляхам культурных і палітычных пераўтварэнняў.

Такім чынам, у якасці дамінуючых грамадскіх ідэалаў рэалістычнай парадыгмы XIX ст. выступаюць праўда, свабода, воля да жыцця і народ як самастойны суб’ект культуры. Сродкамі рэалізацыі ідэалаў і дасягнення гарманічнага існавання беларускага народа ў свеце выступаюць: негвалтоўны пасіўны супраціў шляхам добрасумленнай працы, захавання маральнасці, цярплівасці і боскай пакоры, а таксама пераўтварэнне энергіі пакут у энергію актыўнага дзеяння. Змаганне за ідэал свабоды і апраўданае змаганне, абарона сваёй «мужыцкай праўды» – гэтымі ідэаламі прасякнута культура беларускай мастацкай рэфлексіі як крыніцы духоўнай сілы нацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Багушэвіч, Ф.* Творы / Ф. Багушэвіч. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 206 с.
2. *Каліноўскі, К.* Мужыцкая праўда // Тварам да шыбеніцы : Кастусь Каліноўскі і Паўстаньне 1863–1864 гадоў у беларускай і летувіскай паэзіі : Анталогія / Я. Янушкевіч. – Ракаў, 2013. – С. 21–33.
3. *Лучына, Я.* Творы : Вершы, нарысы, пер., лісты / Я. Лучына. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 206 с.
4. *Пазняк, З.* Новае стагоддзе / З. Пазняк. – Вільнюс : Т-ва беларус. культуры ў Летуве. – Варшава : Беларус. ведамасці, 2002. – 105 с.
5. *Рагуля, А. У.* Зерне характва : культурфіласофскія нататкі / А. У. Рагуля. – Мінск : Выд. Віктар Хурсік, 2013. – 272 с.

*О. Д. Захаревич, магистрант БГУКИ*
*Научный руководитель – И. Н. Воронович,*
*кандидат культурологии, доцент кафедры культурологии*

## ПРОЧТЕНИЕ СИМВОЛА В БЕЛОРУССКОЙ КУЛЬТУРЕ

С позиций семиотической концепции культура в целом рассматривается как знаково-символическая система; специфический надындивидуальный механизм хранения, передачи и выработки текстов культуры, содержащих идеи, идеалы, нормы, ценности, представления, знания, религиозные верования и другие компоненты культурного опыта социальной, этнической или национальной общности. Иными словами, культура представляется как коллективная память, цель которой – трансляция информации от поколения к поколению. К основным формам культуры, служащим для реализации данной цели, можно отнести артефакты, знаковые системы и модели поведения.

Чтобы стать частью культуры, любое событие или явление должно стать элементом текста, в частности должно быть «записано» в культуру в некоторой форме. Под текстом в широком смысле понимается «система линейных последовательностей символов, заданная культурными кодами» [3, с. 25]. Символизация оказывается одной из таких форм, удобных для существования, сохранения и воспроизведения информации культурного опыта, что связано с особенностями символа как знаковой формы особого рода, обладающей свойством аккумулирования информации.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ